ШЧУЧЫНСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ БІБЛІЯТЭКА

# Пазнавальныя краязнаўчыя маршруты па Шчучынскаму раёну


Мотыли
Первомайская
Бершты
Ходилони
Новы
Двор
Бакшты
Василишки
Острына
Демброво
Желудок
ЩУЧИН
Каменка
Липичанка
Рожанка
Орля

# Частка I. Храмы

## Шчучынскі касцёл Святой Тэрэзы

З 20-х гадоў 18 стагоддзя Шчучын апынуўся пад уладай старажытнага рода Сцыпіёнаў дэль Кампа, якія валодалі мястэчкам амаль да пачатку 19 стагоддзя і шмат зрабілі для яго развіцця. У 1726 годзе Сцыпіёны заснавалі калегію піяраў, пры якой былі створаны семінарыя і вышэйшая школа.

У 1742 годзе Тарэза Хлябніцкая-Юзэфовіч Сцыпіён заснавала шпіталь і запрасіла ў Шчучын канвент сясцёр міласэрднасці. Пры Сцыпіёнах у другой палове 18 стагоддзя ў Шчучыне быў пабудаваны палац, у якім размяшчаецца ДУА "Шчучынскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі". У 1762 годзе Ігнацій і Марыяна Сцыпіёны ахвяравалі суму ў 60 тысяч злотых на будаўніцтва ў Шчучыне мураванага касцёла і 50 тысяч злотых былі атрыманы ад Сцыпіёнаў шчучынскаму ксянзу-піяру Брэнэту.

Праз жаніцьбу князя Францішка Ксаверыя Друцка-Любецкага на Марыі Сцыпіён дэль Кампа Шчучын у першай палове 19 стагоддзя перайшоў да вельмі заможнай сям'і Друцка-Любецкіх. Князь Друцкі-Любецкі для ўпрыгожвання свайго вотчыннага мястэчка Шчучына пабудаваў многія мураваныя будынкі: паштовы і Гасцінны дамы, флігелі і лаўкі, а для размяшчэння існуючай у мястэчку школы піяраў быў узведзены вялікі двухпавярховы кляштар.

У 1822 годдзе князь Друцкі-Любецкі пачаў будаўніцтва мураванага касцёла, на які Сцыпіёны ахвяравалі 60 тысяч злотых (або 9000 рублёў серабром). Манахі-піяры са свайго асабістага фундуша дабавілі на будаўніцтва касцёла яшчэ 7500 рублёў серабром. Але ўсіх гэтых грошай хапіла толькі на ўзвядзенне фундамента і часткі касцельных сцен. Князь, жадаючы як мага хутчэй пабудаваць храм Божы, выдзеліў уласныя матэрыялы і работнікаў, а таксама панёс іншыя, даволі значныя выдаткі.

У 1837 годзе Губернскае Праўленне правяло ацэнку ўсіх выкарыстаных матэрыялаў, працу работнікаў і майстроў: будаўніцтва мураванага касцёла абыйшлося ў суму 21 627 рублёў 23 капейкі, а кляштара – у 25452 рублі 63 капейкі серабром.

Не захавалася імя аўтара пабудовы, аднак аналіз яе архітэктуры дае падставу сцвярджаць, што гэта быў хтосьці з правінцыяльных архітэктараў, знаёмы толькі з агульнымі прынцыпамі культавай архітэктуры таго часу. Аўтар касцёла выкарыстаў "тыпавую схему", характэрную культавым пабудовам класіцызму – салучэнне крыжова-купальнага аб'ёму і класічнага порціка,

спалучэнне дарычнага ордэра, як асноўнага элемента архітэктурнай кампазіцыі з руставанымі сценамі і паўцыркулярнымі аконнымі праёмамі.

У Нацыянальным Гістарычным Архіве г.Гродна захаваўся акт інвентарызацыі, праведзенай у 1839 годзе ў Шчучынскім касцёле св. Тэрэзы, з якога можна даведацца, што ўяўляў сабой касцёл у тыя далёкія часы: “…Касцёл прылягае да кляштара піяраў і фронтам звернуты на ўсход. Пакрыты гонтамі. У купале ёсць дзверы для выхаду на дах. На верхняй частцы купала васьміграннная вежа з бляшаным дахам, а на яе вяршыні шар з уманціраваным драўляным крыжом. Над уваходам у касцёл стрэлкі гадзінніка, пакрытыя бронзай, а сам гадзіннік адбівае кожную гадзіну званкамі, схаванымі пад дахам. Заводзіцца ён з дапамогай свінцовых гіраў, падвешанных на вяроўках. Вышэй над цыферблатам, на гонце, пафарбаванай у чырвоны колер, промні жоўтага колеру, у якіх праглядаюць тры крыжа і надпіс слова “Марыя”. Усяго вокнаў у касцёле 14, якіх 7 меншых памераў. У касцёле размешчана 7 алтараў: на першым, галоўным, выява Хрыста на крыжы, на другім – св.Іосіфа, на трэцім – св.Антонія, на чацвёртым – Іосіфа Захавальніка, на пятым – св.Марыі, на шостым – св.Флар’яна, на сёмым – св.Тэрэзы.  Яшчэ 2 алтары знаходзяцца ў капліцах. На сценах касцёла іконы св.Вікенція, св.Даніэя Караля, св.Лукаша, св.ганны, св.Лазара, св.Роха, сэрца Хрыста.

У левым крыле касцёла, на ўзроўні падлогі знаходзяцца рашотка, за якой драўляная лесвіца вядзе ў невялікі склеп, прызначаны для пахавання фундатараў гэтага касцёла…”.

У акце інвентарызацыі падрабязна ўказана колькасць рухомай маёмасці пры касцёле: агульная колькасць рыз – 76, пакрывал – 29, настольных пакрывал – 56, дываноў – 11, харугваў – 7, срэбраных вырабаў – 18 штук, латунных – 18, медных – 7, цынкавых – 108, хрустальных – 41, драўляных – 80, абрадавых кніг – 26, метрычных кніг – 26 і г.д.

Яшчэ трэба адзначыць, што ў той час у Шчучыне існаваў драўляны касцёл, які размяшчаўся на адной прамой паміж капліцай на могілках і новым мураваным касцёлам. Гэты касцёл, пабудаваны князямі Юзэфовічамі і Сцыпіёнамі да 1839 года перакасіўся і знаходзіўся ў аварыйным стане і таму рэшткі маёмасці былі перанесены са старога касцёла ў новы.

На Паштовым тракце ў накірунку Гродна на адлегласці ў адну мілю (9 км) размяшчаўся драўляны касцёл, ля якога на чатырох слупах былі замацаваны 2 званы. Апошнія лічыліся за Шчучынскім касцёлам. Гэта была самастойная парафія, са сваімі кнігамі ўліку і ўсім неабходным. Для абслугоўвання гэтых касцёлаў у кожным былі арганісты, закрыстыян і дзед.

У 1867 годзе манастыр быў закрыты, а касцёл застаўся як парафіяльны. У 1945 годзе манастырскія карпусы перадалі вайсковай часці. У 1946 годзе быў праведзены рамонт касцёла – пабелены ўнутры і звонку. У гэты ж час была пабудавана капліца. Наступны рамонт касцёла адбыўся ў 1952 годзе – дах пакрылі шыферам, зноў пабялілі сцены, часткова адрамантавалі цокаль, а таксама да касцёла была прыбудова.

У 1964 годзе ксяндза Пятрашку са Шчучынскага касцёла перавялі ў другі прыход, а праз год касцёл закрылі. У 1966 годзе касцельную маёмасць пагрузілі на машыны і вывезлі ў Троіцкі касцёл у Ішчална. А вось куды ў далейшым трапілі срэбраныя падсвечнікі, чашы і іншыя культавыя рэліквіі са Шчучынскага касцёла – невядома. Арган, які знаходзіўся ў касцёле, быў разбіты і зламаны, таксама былі разбіты і прыгожыя венецыянскія вітражы.

У лютым 1969 года рашэннем Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР будынак касцёла быў перададзены вайсковай часці для выкарыстання яго ад клуб. Прыхаджане вымушаны былі праводзіць богаслужэнне пад адкрытым небам. Неаднаразова вернікі звярталіся ў вышэйстаячыя інстанцыі з просьбамі аб перадачы ім знятага з рэгістрацыі будынка касцёла ў Шчучыне. Так, пасылалія  пісьма на імя Брэжнева Л.І., Грамыкі А.А. і інш. У 1980 годзе выканкам Шчучынскага раённага Савета народных дэпутатаў прыняў рашэнне правесці ў касцёле рэстаўрацыйныя работы і прыстасаваць яго пад цэнтр эстэтычнага выхавання. Але работы ў гэтым накірунку вяліся вельмі марудна.

У кастрычніку 1988 года быў атрыманы дазвол адкрыць будынак касцёла і перадаць яго рэлігійнаму таварыству католікаў для выкарыстання ў культавых мэтах. 6 лістапада таго ж года з касцёла ў Ішчалне была вернута маёмасць у шчучынскі касцёл: арнаты, бляшаныя падсвечнікі, жалезны крыж і іншае. пачалося аднаўленне разбуранага  будынка. Быў зроблены жалезны дах, гранітная падлога, вітражы ў жалезных рамах, галоўны алтар, праведзена пабелка і афарбоўка, быў куплены арган, падвешаны званы. Касцёл пачаў сваё новае жыццё.






# Касцёл Святога Яна
# аг.Васілішкі

Згодна старажытных крыніц крыжакоў, на рубяжы 13-14 стагодзяў у Васілішках былі дзве драўляныя абарончыя крэпасці. Улічваючы, што мястэчка месціцца на крыжоўцы дарог, што вядуць на Ліду, Гродна, Забалаць, Беліцу, на Васілішкі часта нападалі з боку Друскенікаў крыжакі, аз боку Беліцы – татары. У навакольных лясах знаходзіліся абарончыя валы, дзе ад захопнікаў хавалася мірнае насельніцтва.

У 16-18 стагоддзях у Васілішках існавала мясцовае самаўпраўленне, на чале якога стаяў стараста. Тут былі развіты кустарныя рамёствы, гандлявалі крамы. Цікава даведацца, хто ж яны – васілішкаўскія старасты? Вось некаторыя прозвішчы гэтых людзей: Глінскі, Кішко, тройчы ў розны час – Кунцэвіч, прадстаўнікі роду Радзівілаў, а пасля 1648 года – Лімонт, Александровіч, Волчак. Кожны з гэтых людзей стараўся штосьці карыснае зрабіць для грамадскасці, пакінуць пра сябе добрую памяць.

Так, у 1658 годзе Марцінам Дамінікам Лемантам фінансіравалася будаўніцтва каменнага касцёла ў стылі барока. У гээтым храме падчас шведскай вайны кароль Станіслаў Ляшчынскі прымаў прысягу на вернасць ад літоўскай шляхты.

У 1790 годзе Васілішкі налічвалі 171 дом, гэта значыць, былі крыху меншымі, чым Ліда (229 дамоў), але большымі чым Радунь (116 дамоў). Жыхары мястэчка актыўна ўдзельнічалі ў паўстанні 1963 года. Пасля гэтых падзе ксяндза Ануфрыя Сырвіда саслалі ў Сібір, а касцёлператварылі ў праваслаўную царкву. Пасля першай сусветнай вайны касцёл быў перададзены каталікам. Ён носіць імя Святога Яна. У гады Вялікай Айчыннай вайны храм палілі, аледзякуючы намаганням вернікаў і ксяндза Піваваруна Кляменса касцёл быў у кароткі тэрмін адрамантаваны, і ў ім рэгулярна праходзілі багаслужэнні.

Каталіцкі храм, касцёл Святога Іаана Хрысціцеля, з’яўляецца архітэктурным помнікаў, які пабудаваны ў стылі позняга барока ў 1796 годзе. Для яго стварэння выкарыстоўвалася цэгла. У той час ён адносіўся да базыліянскага манастыра, аднак іншыя забудовы, якія ўваходзяць ў кампазіцыю, не змаглі перажыць час.

На сённяшні дзень касцёл уяўляе сабой базіліку з трыма нефамі, захрыстамі і апсідай, якія маюць фому паўкруга. Пярэдняя частка будынку – гэта пара вежаў, кожная з якіх складаецца з 3 ярусаў. Яны злучаны ў

агульную кампазіцыю за кошт паўкруглага шчыт, які знаходзіцца паміж вежамі, перад будынкам можна знайсці трохярусную браму. Унутры размяшчаецца абраз, які атрымаў назву “Хрышчэнне”, якая датуецца пачаткам 20-га стагоддзя. Ёсць сем алтроў, у якіх праглядваецца стыль рокако.

Гістарычны храм меў скляпеністыя перакрыцці нефаў, аднак ў ходзе перабудоў яны былі згублены і заменяныя плоскімі драўляным столем. Галоўны алтар храма багата дэкарыраваны ляпнінай, у яго цэнтры знаходзіцца палатно “Хрышчэнне Гасподня”. Усяго ў інтэр’еры царквы 7 алтарэй – галоўны, два бакавых і 4 алтара на калоных, якія выкананы ў тэхніцы стуко пад ружовы і блакітны мурмур, урыгожаны пазалочаным ляпнінным дэкорам.

Храм акружаны агароджай з бутавага камня з трохстворкавыя вароты.





# Царква Святога Архангела Міхаіла

Царква Святога Архангела Міхаіла знаходзіцца ў г.Шчучыне, на жаль гістарычных звестак пра яе захавалася вельмі мала. З крыніц, даступных шырокаму колу чытачоў, можна даведацца, што Міхайлаўская царква ў Шчучыне была пабудавана ў канцы 19 стагоддзя ў псеўдарускім стылі. Калі ж звярнуцца да дарэвалюцыйных даведнікаў, то высветліцца, што ў канцы 19 стагоддзя ў горадзе было две царквы. Аднак успамінаў пра другую захавалася вельмі мала.

Значную дапамогу ў выяўленні ісціны аказвае знаёмства з рэлігійным часопісам 19 і пачатку 20 стагоддзяў "Літоўскія Епархіяльныя Ведамасці". Надрукаваныя на яго старонках матэрыялы сведчаць аб тым, што царква ў Шчучыне існавала з "незапамятных часоў". Найбольш верагодна, што гэтыя "незапамятныя часы" адносяцца да 15 і пачатку 16 стагоддзя. Гэта была старажытная драўляная царква Спасіцеля Мікалая Мірлікійскага Цудатворца. Пакуль нам не вядомы ні імёны яе заснавальнікаў, ні падрабязнасці яе дзейнасці.

Пасля Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 года Шчучынская царва адыйшла да ўніятаў. У якасці ўніяцкага храма яна была знішчана пад час вайны Рассіі і Рэчы Паспалітай 1654-1667 гадоў. Верагодна, што гэта зрабілі бязлітасныя казакі, якія ў 165-1656 гадах рабавалі Шчучынскую зямлю.

Пасля разбуральных войнай сярэдзіны 17-пачатку 18 ст.ст. Шчучын паступова стаўаднаўляцца. Але гэта не закранула царкву. У 18 стагоддзі праваслаўнае насельніцтва Рэчы Паспалітай лічылася палітычна ненадзейным і будаўнітва праваслаўных храмаў не вялося.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі зноў паўстала пытанне аб аднаўленні шчучынскай царквы. Асабліва актыўна гэтага дабіваўся шчучынскі дабрачынны святар Мікалай Іванавіч Тэадаровіч (1823-1876). Новы храм будаваўся за дзяржаўны кошт. Гэта і была наша сённяшняя царква Міхаіла Архангела. Яна асвечана і пачала дзейнічаць з восені 1865 года. Пасля пабудовы храма ўтварыўся шчучынскі праваслаўны прыход, які ахоплівае Шчучын, Ражанку і 23 навакольныя вёскі. Цікава адзначыць, што на карысць новапабудаванай шчучынскай царквы былі зроблены ахвяраванні з усёй Расіі. Так, толькі тамбоўскіх чыноўнікаў Колабава і Смірнова, купцоў Малініна, Шклова, Купрыянава і Талсташэніна паступіла 350 рублёў срэбрам. Самы каштоўны падарунак зрабіў у 1866 годзе гвардыі

капітан У.Ф.Панюцін. Ён ахвяраваў старажытнае Евангеліе ў акладзе з пазалочанага срэбра.

Пасля смерці М.Тэадаровіча шчучынскім дабрачынным святаром з’яўляўся Мікалай Пігулеўскі, а непасрэдна шчучынскім святым айцом – Георгі Тарановіч. Дзякуючы іх намаганням, у Шчучыне з’явіліся дзве царкоўна-прыходскія школы – асобна для хлопчыкаў і асобна дзя дзяўчынак. Прычым дакладна вядома, што для кожнай школы быў пабудаваны свой будынак. Пры царкве ўтварыўся хор, які ў 1887 годзе прыемна ўразіў ковенскага епіскапа Антонія сваімі прыгожымі мілагучнымі спевамі.

Цікава, што другая царква ў Шчучыне сапраўды была. Яна асвячалася 5 верасня 1876 года. Гэта была драўляная пабудова на шчучынскіх могілках. Дрэва – не самы даўгавечны будаўнічы матэрыял. Таму зразумела, што царква не перажыла ваеннага ліхалецця 20 стагоддзя.







# Касцёл Найсвяцейшай Троіцы в.Ішчална

У паўночна-заходняй частцы вёскі знаходзіцца касцёл Найсвяцейшай Троіцы. Пабудаваны ён ў 1755–58 гг. з цэглы па фундацыі гродзенскага харунжага Язэпа Валы на месцы драўлянага храма 1670–78 гг. Побач з касцёлам у 19 ст. з цэглы ўзведзена аднаярусная чатырохгранная шатровая званіца.

Храм з’яўляецца помнікам архітэктуры позняга барока. Касцёл аднанефавы, двухвежавы з пяціграннай апсідай і бакавымі сакрысціямі. Архітэктурная кампазіцыя мае выцягнутую па вертыкалі аб'ёмную будову з геаметрычна выразных вялікіх мас. Вузкую цэнтральную плоскасць галоўнага фасада завяршае фігурны франтон, фланкіруюць чатырохгранныя вежы, ярусы якіх вылучаны карнізамі, расчлянёны прамавугольнымі панэлямі, прарэзаны лучковымі і паўцыркульнымі прасветамі. Плоскасныя бакавыя фасады завершаны карнізам і расчлянёны двума ярусамі лучковых аконных праёмаў.

Малітоўная зала выцягнута па падоўжнай восі і разам з апсідай перакрыта драўляным лучковым скляпеннем, якое замяніла ранейшае мураванае. Сцены крапаваны тонкімі падвойнымі лапаткамі і апяразаны шырокім карнізам. Над нартэксам хоры. Тры алтары і амбон выкананы ў стылі ракако. Галоўны алтар – асноўны пластыка-дэкаратыўны акцэнт афармлення інтэр'ера – займае ўсе 3 сцяны апсіды. Яго першы ярус устаноўлены на высокім цокалі, падзелены карынфскай каланадай на 3 часткі, аддзелены ад другога яруса хвалепадобным антаблементам з ляпным дэкорам, у цэнтры вялікі абраз «Святая сям'я», злева – «Св. Пётр», справа – «Хрышчэнне». У цэнтры другога яруса круглая люкарна, па баках жывапісныя панэлі, дэкаратыўныя вазы і выявы анёлаў. Два бакавыя алтары святой Ганны і Маці Божай Вастрабрамскай меншыя, увенчаны скульптурнымі выявамі святых Францішка і Варвары сярод анёлаў і ракайльных звіваў. Пабудаваны яны ў выглядзе пласцін, расчлянёных на два ярусы тонкапрафіляванымі і раскрапаванымі антаблементамі, фланкіраваны калонамі, капітэлі якіх з'яўляюцца пастаментамі для пуцці. Асноўны лейтматыў арнаментальна-пластычнай кампазіцыі алтароў – бясконцыя раскрапоўкі, звівы, дробныя, ювелірна вытанчаныя арнаментальныя клубкі з мудрагелістым узорам. На правай сцяне ляпная экспрэсіўная, дынамічная гарэльефная кампазіцыя «Архангел Міхаіл, які топча д'ябла» – шэдэўр мастацтва ракако. Высокамастацкім дэкаратыўна-скульптурным творам з'яўляецца амбон. Яго кафедра – пластычная чаша, падтрыманая кансоллю-ракавінай. Ракайльныя панэлі на яе гранях запоўнены ляпнымі кампазіцыямі на

евангельскія тэмы. Кафедру ажыўляюць выявы дэльфіна, марскога льва, арла ў пене звіваў і ракайляў. Праз спрошчаную фігурную панэль кафедра аб'яднана з балдахінам, завершаным экспрэсіўнай кампазіцыяй з выявай святой з крыжом і пуцці. Размах і насычанасць скульптурнага і ляпнога дэкору эфектна кантрастуюць з лаканізмам архітэктурных плоскасцей інтэр'ера.

Помнік 2 катэгорыі каштоўнасці, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей (пратакол Навукова-метадычнай Рады № 88 ад 28.08.2003).

**Сонечны гадзіннік**

З паўднёвага боку Траецкага касцёла знаходзіцца сонечны гадзіннік. Ён уяўляе сабой круглы абцясаны пастамент з каменю вышынёй каля 1 м і дыяметрам каля 0,5 м. Двума стальнымі стрыжнямі да яго прымацавана медная круглая пласціна дыяметрам 0,3 м. Трохвугольная стрэлка напалову зламаная. На пласціне выгравіраваны: цыферблат, прозвішча майстра (J. Malecki), месца вырабу (Wilna), геаграфічная шырата в. Ішчална (54*41"2’). Гэты гадзіннік адносіцца да класу гарызантальных сонечных гадзіннікаў з трохвугольнай стрэлкай, верхні вугал якой скіраваны на Палярную зорку. Цень ад стрэлкі падае на гарызантальны цыферблат, часавыя дзяленні якога няроўныя між сабой. Гадзіннік — цікавы ўзор дакладнай механікі, выраблены у Вільні ў XVIII ст.






## Свята-Іаана-Багаслоўская царква
## аг.Дэмбрава

Першы драўляны храм ў аграгарадку Дэмбрава была пабудавана ў 1830 годзе вернікамі. 22 лістапада 1834 года па загаду Гродзенскага губернатара касцёл у Дэмбраве быў перададзены пад уніяцкую прыхадскую царкву. Вядома, што ў 1886 г. у мястэчку было 2 храма, але ў першай палове 20 ст. драўлянай царквы ўжо не існавала.

Драўляны праваслаўны храм, які сёння мы можам убачыць у аграгарадку Дэмбрава, быў пабудаваны ў 1930-х гадах у вёсцы Завалкі. У 1962 годзе памёр пробашч парафіі протаіерэй Вікенцій Ненартовіч і царква была закрыта. Да 1991 года будынак выкарыстоўваўся мясцовым калгасам як збожжасховішча.

У 1991 годзе была зарэгістраваная праваслаўная грамада. Намаганнямі вернікаў Дэмбрава, будынак храма быў перанесены з вёскі Завалкі. 17 ліпеня 1993 года храм быў асвячоны архіепіскапам Валянцінам . Царква пабудаваны з дрэва ў традыцыях народнага дойлідства. Трохзубны храм: прытвор-званіца, малітоўная зала пад 2—схільным дахам, вузейшая аспіда пад вальмавым дахам. Дамінантнай аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі з’яўляеццв 3-х ярусная званіца, завершаная цыбулепадобным купалам. Гарызантальна ашаляваныя фасады (цокальная частка – вертыкальная) рытмічна расчлянёны лучковымі аконнымі праёмамі. Уваход адзначаны 2-слуповым ганкам пад 2-схільным пакрыццём.



# Царква-крэпасць Раства Багародзіцы

Мураванскую царкву-крэпасць яшчэ называюць Маламажэйкаўскай, так як раней яна адносілася да вёскі Малое Мажэйкава Лідскага раёна. Дакладная дата пабудовы невядома, але храму не менш 500 гадоў. Найбольш верагодна, што царква ўзводзілася паміж 1516 і 1524 гадамі. Сродкі на яе выдзяліў уладальнік Мажэйкава – Шымко Мацкевіч-Шкленскі.

У цэркві захаваліся дзве мармуровыя пліты над склепам, адна з іх замуравана ў сцену з надпісам :"Найвялікшаму і наймілейшаму Богу". На другой пліце ёсць выява воінскіх даспехаў і зброі польска-літоўскага войска з надпісам: "Найвялікшаму і наймілейшаму Богу і Яго славу паставіў гэты помнік у цэркві на вечную памяць Казімір з Кастрова Кастравіцкі, дзедзіч ў Мажэйкаве Лідскага павету і ў Падоліі Слонімскага павету. Аднавіў цэркву і дундаваў алтар рымскага абраду для жалудоцкіх кармялітаў. 1822 год"

Рашэнне пабудаваць менавіта абарончы храм аказалася вельмі дальнабачным. Царква-крэпасць мноства разоў імкнуліся ўзяць штурмам пад час войнаў. Але святыня са сценамі таўшчынёй ў 2 метра амаль заўсёды вытрымлівала аблогу і хавала мясцовых жыхароў. Дарэчы, у Беларусі ёсць толькі два помніка абарончага дойлідства гатычна-рэнесанснага стыля, другі размешчаны ў Сынкавічах.

У канцы 16 стагоддзя царква была перададзена ўніятам. Калі беларускія землі апынуліся ў складзе Расійскай імперыі, яе вярнулі праваслаўным. Больш таго, святыню адрамантавалі па загаду цара Аляксандра I, які праездам апынуўся ў Мураванцы. Пасля Першай сусветнай вайны будынак выкарыстоўвалі як касцёл, а зноў праваслаўным храмам ён стаў у канцы 20 стагоддзя.

З храмам звязана трагічная легенда, у якой замяшаны бляск золата, шляхецкія амбіцыі і непахісная вера ў Бога:

…апекуном мураванскай царквы быў уплывовы пан – Казімір Кастравіцкі, а святаром у храме быў яго сябра Пятро Афанасьевіч. Казімір і Пятро былі аднагрупнікамі і разам вучыліся ў Вільні. У 1790-я гады па Шчучыну разнясліся незвычайныя чуткі: гаварылі, што святар, у тайнеад усіх, скраў гроб заснавальніка царквы Шымка Мацкевіча і знайшоў шырокі пояс са скарбам, мноствам залатых вырабаў і 2 запіскі, у якіх паказаны былі месцы, дзе схаваны скарб. Хутка чуткі дайшлі і да Казіміра Кастравіцкага. Злы пан збіў і пасадзіў пад арышт святара, на яго вачах задушыў жонку і маці Пятра. Ледзь жывы святар прасіў былога сябра не забіваць дзяцей і паверыць яму.

Але здзекамі пан нічога не дабіўся. Тады пан вырашыў дзйнічаць хітрыкамі – напаіў Пятра, але і гэта нічога не дало. Тады пан наказаў пасадзіць святара на ланцуг са свінямі ў хляве. Цэлу зіму Афанасевіч правёў у кайданах на марозе. Пан жа ў той час зусім з’ехаў з глузду, ён увесь час думаў толькі пра золата: спаліў дакументы, якія захоўваліся ў архіве царквы ў печы, разбурыў дах храма, перакапаў падвалы і зямлю вакол храма, але нічога так і не знайшоў.

Магутная царква абарончага тыпу з вокнамі-байніцамі, тоўстымі сценамі, магутнай кірпічнай кладкай, круглымі вежамі з вінтавымі лесвіцамі ў розныя часы служыла не толькі месцам пакланення і малітваў, але і абаронай мясцовых жыхароў пад час ваенных дзеянняў. Неаднаразова храм разбураўся: у 1656 годзе пад час вайны Расіі з Рэччу паспалітай, у 1706 годзе – царква папала пад пушачны абстрэл швецкай арміи Карла XII. Выгляд храма значна змяніўся пад час капітальнага рамонту ў 1871 – 72 гг.

Архітэктура забудовы спалчае ў сабе рысы позняга стылю і элементы рэнесанса. Па вуглах храма размешчаны цыліндрычныя вежы. Стены і вежы упрыгожаны двайнымі аркамі. Вежы круглыя: дыяметр заходніх каля 4.5 метраў, усходніх каля 3 метраў. Пад палом скляпеністае складскае памяшканне. Уся забудова ахоплівае дэкаратыўны паясок з белй цэглы. Алтар знаходзіцца ва ўсходняй частцы. Пасад адзін, каменны, квадратнай формы. Маламажэйкаўская царква-крэпасць можа “пахваліцца” венецынскай аркай – адзінай у Беларусі.

Да пачатку XIX стагоддзя ў царкве былі жалезныя дзеверы, якія апускаліся (герсы). Пры перабудове 1817 і 1871-1872 гадоў да галоўнага фасааду прылягае прытвор, пабудаваны заходнія башні, паніжана крыша, пастроены карнізы, павялічаны вокны.

У Мураванскай царкве можна убачыць артэфакты, створаныя ў 16 стагоддзі: чарапіцу, якая пакрывала дах храма, цэглу з адбіткамі “ сярэднявечных коцікаў” і шмат інш.

